# Спытаць у пісьменніка

Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі распачалі новы праект «Дваццаць пытанняў пісьменніку». Кожны месяц у зале беларускай літаратуры кніжніцы будзе праходзіць сустрэча з пісьменнікам, творчасць якога мае адметнае значэнне для нацыянальнай культуры. Першая імпрэза была прысвечана жыццю і творчасці вядомага паэта, празаіка, перакладчыка, мовазнаўцы, публіцыста, літаратурнага крытыка і літаратуразнаўцы Міхася Пазнякова. Ён аўтар больш як ста кніг самых розных жанраў, адрасаваных юным і дарослым чытачам. У яго творчым багажы таксама і пераклады шматлікіх кніг паэзіі і прозы класікаў і сучасных літаратараў многіх краін. Вядомы ён і як мовазнавец: аўтар, напрыклад, такіх выданняў як «Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы» у двух тамах, «Школьны слоўнік беларуска-рускіх амонімаў». За шматгадовую літаратурную дзейнасць узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны і «За працоўныя заслугі». З'яўляецца лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі і шматлікіх іншых рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных прэмій. Яму прысвоена высокае званне — «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь».

Ва ўтульную залу беларускай літаратуры на сустрэчу з пісьменнікам прыйшлі супрацоўнікі публічных і дзіцячых бібліятэк краіны, а таксама студэнты бібліятэчнага факультэта БДУКМ. Тут была разгорнута вялікая выстаўка кніг аўтара. Міхась Паўлавіч адказваў на пытанні прысутных, разважаў пра стан нацыянальнай літаратуры, чытаў новыя вершы, знаёміў са сваімі новымі кнігамі, дзяліўся творчымі планамі. Усе яго адказы, разважанні і згадкі былі прасякнуты сыноўняй удзячнасцю роднай зямлі, бацькам і настаўнікам, любоўю да нашай культуры, да Радзімы, пашанай да мужных і працавітых людзей. Галоўнае, пра што даводзіў шаноўны госць, — толькі ў адзінстве грамадства і ў вернасці нашым выдатным папярэднікам, нашым руплівым і адважным бацькам і дзядам, у настойлівай вучобе і працы, у дружбе і супрацоўніцтве з усімі краінамі і народамі, а ў першую чаргу з братняй Расіяй — наша шчаслівая будучыня.

**Павел КУЗЬМІЧ**